А. Барадзіна, С. А. Сігаева

# ІНТЫМНЫЯ ПАЧУЦЦІ Ў ЛІРЫЦЫ У. ШЭКСПІРА І М. БАГДАНОВІЧА

Тэма кахання з’яўляецца спрадвечнай у мастацкай літаратуры. На працягу развіцця літаратуры пісьменнікі розных эпох і культур адлюстроўвалі інтымыя пачуцці ў сваёй лірыцы. Тыпалогія кахання была распрацавана Джонам Аланам Лі на падставе даследаванняў старажытнагрэцкіх і лацінскіх філосафаў у працы «Colours of Love: An Exploration of the Ways of Loving» (1973). Гэтая тыпалогія ўключае тры асноўныя тыпы: Сторгэ (пяшчотнае каханне, падобнае да сямейнага), Эрас (рамантычнае каханне, стыхійнае, заснаванае на фізічным цягненні, захапленні, закаханасці) і Людус (каханне, заснаванае на атрыманні фізічнага задавальнення), якія ў сваіх змешваннях даюць яшчэ тры: Прагма (каханне з мэтай атрымання карысці), Манія (каханне-апантанасць, аснова якой – запал і рэўнасць), Агапэ (ахвярнае, безумоўнае каханне). У Старажытнай Грэцыі вызначалі яшчэ адзін тып – Філія (каханне-сяброўства).

Сярод пісьменнікаў тэмай кахання асабліва захапляліся рамантыкі. У сваім даследаванні мы зробім спробу кампаратыўнага аналізу творчых падыходаў М. Багдановіча і У. Шэкспіра да адлюстравання тэмы кахання. Важна адзначыць, што адрозненне бачання гэтай тэмы аўтарамі грунтуецца на тым, што яны з’яўляюцца прадстаўнікамі розных культур, краін і эпох. Уплыў Шэкспіра на развіццё англійскага рамантызму бясспрэчны. М. Багдановіч таксама быў блізкі да гэтага літаратурнага кірунку.

У сваім паэтычным слоўніку В. Рагойша пра рамантызм пісаў, што для гэтай плыні важным быў «унутраны свет, моц характару, вышыня ідэалаў чалавека. Рамантызм … procіпаставіў рэальнаму ідэальнае, завастрыў увагу на выключных характарах, падзеях, пачуццях», што адлюстроўваецца ў творах абодвух аўтараў, творчасць якіх параўноўваецца ў дадзеным даследаванні.

Звяртаючыся да гісторыі эратычнай паэзіі ў Англіі, трэба сказаць, што пачатак ёй паклалі Філіп Сідні і Э. Спенсер любоўнай паэмай «Astrophel and Stella» і цыклам санетаў «Amoretti». Але неверагодную моц лірыцы кахання надаў Уільям Шэкспір. Ён адлюстраваў непераадольнае каханне як касмічную сілу, надзею, перамогу над часам.

Гэты аўтар раздзяляе каханне і жарсць, надаючы асобнае месца кожнаму з аспектаў. Гаворачы пра жарсць, У. Шэкспір абыгрывае ўласнае імя: *will*– жаданне, пажадлівасць, запал, праз гэта выяўляецца адлюстраванне такіх тыпаў кахання, як Эрас і Манія:

Whoever hath her wish, thou hast thy Will,
And Will to boot, and Will in overplus;
More than enough am I that vex thee still,
To thy sweet will making addition thus.

Каханне Шэкспіра пакутлівае, ліхаманкавае, сляпое, хітрае, шматаблічнае, што мажліва часткова аднесці да Маніі:

O cunning love, with tears thou keep'st me blind,
Lest eyes, well seeing, thy foul faults should find.

Наогул жа зямное каханне ў Шэкспіра амбівалентнае: боль і асалода, праўда і хлусня, рай і пекла. Праз перапетыі зямнога кахання Шэкспір, у плыні платонаўскай традыцыі, падзяляе жарсць, у аснове якой Людус, і ўзнёслае, ідэальнае каханне, якое праяўляецца ў яго творчасці не моцна выяўленым Агапэ.

У эратычнай паэме «Venus and Adonis» Венера прагне цялесных асалод, а Аданіс выступае за платанічнае каханне, не абцяжаранае целам. Такім чынам мастак слова супрацьпастаўляе Людус і Агапэ.

Шэкспір выкарыстоўваў складаную сімволіку. Частая згадка маланкі не выпадковая: каханне – касмічны агонь, які асвятляе жыццё. Санеты – драматычныя перапетыі любоўнага трыкутніка, які складаецца з самога паэта, яго светлага сябра і «цёмнай сяброўкі» («смуглявай лэдзі»). Але ёсць і гомасексуальная версія чытання санетаў, якую вызначаюць даследчыкі С. Уэлс і П. Эдмандсан. Вяртаючыся да гіпотэзы «тройцы», якую даследвала В. В. Якушкіна, мы бачым, што «цёмная сяброўка», у якую закаханы абодва сябры, аддае перавагу зусім не паэту:

Be it lawful I love thee, as thou lovest those
Whom thine eyes woo as mine importune thee….
If thou dost seek to have what thou dost hide,
By self-example mast thou be denied!

Спакуслівая, чароўная, хлуслівая дама, якая ўсведамляе свой уплыў, якая дорыць шчасце і пакуту, «цёмная сяброўка» не кахае ні паэта, ні «светлага сябра»:

Beshrew that heart that makes my heart to groan
For that deep wound it gives my friend and me;
Is't not enough to torture me alone…

Іншы падыход да тэмы кахання прадстаўлены ў вершах М. Багдановіча. У цыклах «Мадонны» і «Каханне і смерць» выявіліся мары, спадзяванні паэта, яго інтымныя пачуцці, шчырыя прызнанні ў каханні. Каханне выяўляецца праз пачуццё бязмернай павагі да жанчыны і асэнсаванні яе прызначэння ў ролі маці. Сама каханая мае рысы Дзевы Марыі, якая паказвае найвышэйшую любоў (безумоўнае каханне) – любоў да дзіцяці, што адносіцца да тыпа Агапэ. Вобраз Дзевы Марыі адлюстроўвае красу, дабрыню, пяшчоту, тыя крыштальна чыстыя маральныя сілы, што яшчэ Адраджэннем былі ўвасоблены ў постацях і рысах твараў мадоннаў. Таму асобную, другую частку «Вянка», і называў паэт «Мадоннамі».

Таксама высокае каханне, выражанае праз Эрас (стыхійнае, заснаванае на закаханасці і захапленні), прадстаўлена ў вершы «Вераніка», дзе выразанае на ліпе імя каханай падымаецца і мацнее з часам, як узвышаецца і пачуццё героя:

І к небу надпіс «Вераніка»...
Чым болей сходзіць дзён, начэй,
Тым імя мілае вышэй...

Вершы М. Багдановіча пра каханне сцвярджаюць ідэю бессмяротнасці, вечнасці гэтага высокага чалавечага пачуцця, яго вялікую жыццёвую і стваральную сілу. Яны спрыяюць раскрыццю лепшых якасцей чалавека, праяўленню гуманнасці, высакароднасці, садзейнічаюць выхаванню пачуцця павагі да жанчыны, захапленню хараством, прывабнасцю, яе душэўнай чысцінёю. І яшчэ адзін акцэнт вылучаў паэт у гэтым цыкле: каханне – гэта поздвіг жанчыны; вышэй ратнага поздвігу ставіць паэт подзвіг маці, якая згодна ахвяраваць сваім жыццём у імя нараджэння дзіцяці:

…У мучэннях памірае, каб жыццё дзіцёнку даць!
(«Тым вянкі суворай славы»)

Пачуццё варта смерці, гераіня гатова на гэтую ахвяру дзеля кахання, яно перадольвае смерць у нашчадках. Каханне і смерць ідуць поруч у інтымнай лірыцы М. Багдановіча. У цыкле, прысвечаным гэтай тэме, пачуццё прадстаўлена тыпам Сторгэ.

Тэма ўзаемадзеяння кахання і смерці таксама прадстаўленна і ў творчасці Шэкспіра. Каханне часта ідзе поруч са смерцю, але яно, насуперак усяму, перамагае, узвышаецца над тленнасцю быцця, злучае час з Вечнасцю. Каханне перадольвае смерць, якая над ім не ўладна.

Падводзячы вынік спробы кампаратыўнага аналізу, зазначым: аб’ядноўвае падыходы аўтараў тое, што ў сваёй творчасці яны абодва аддаюць перавагу Эрасу і Агапэ. Акрамя гэтых тыпаў у творах У. Шэкспіра таксама сустракаюцца Манія і Людус, у вершах М. Багдановіча праяўляецца тып Сторгэ.